


**Т. ЛАЎРЫК**
загадчык аддзела бібліятэказнаўства
Мінскай абласной бібліятэкі
імя А. С. Пушкіна, магістр
філалагічных навук, аспірант БДУ

# “Пад зоркай Венеры”

## Старонкі міжнароднага літаратурнага анлайн-конкурсу чытальнікаў

31 сакавіка 2023 года адбылося святочнае ўганараванне пераможцаў міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў “Пад зоркай Венеры”, які праходзіў у рамках Мінскага абласнога праекта “Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю”.

Міжнародны анлайн-конкурс чытальнікаў “Пад зоркай Венеры” праводзіўся з 1 па 20 снежня 2022 года, да ўдзелу запрашаліся дзеці да 18 гадоў. З мэтай далучэння дзяцей да літаратурнай творчасці, пошуку неардынарных, крэатыўных форм выступленняў было задумана правесці гэты конкурс у рамках абласнога праекта, каб не толькі ўшанаваць памяць вялікага паэта Максіма Багдановіча, але і прыцягнуць увагу шырокай аўдыторыі да чытання і вывучэння беларускай літаратуры, а таксама стымуляваць творчую актыўнасць вучняў школьных і пазашкольных устаноў.

Актыўнасць і вялікая колькасць яго ўдзельнікаў з’яўляецца самым лепшым доказам таго, што творчасць Максіма Багдановіча выклікае цікавасць у дзяцей і моладзі. Арганізатарам конкурсу выступіла Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна сумесна з партнёрамі: Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурным музеем Максіма Багдановіча, Выдавецкім домам “Звязда” (газетай “Літаратура і мастацтва”), Мінскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам юнага гледача, каналам “Культура” Беларускага радыё, Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Аргкамітэтам конкурсу быў сабраны склад сяброў журы для падвядзення яго вынікаў. Улічваючы апошнія тэндэнцыі ў адносінах да дзіцячых літаратурных конкурсаў, мы чакалі, што творчых прац будзе шмат. Таму ішлі прапановы да людзей, якія найбольш кампетэнтна дапамогуць ацаніць працы ўдзельнікаў. У склад журы ўвайшлі дырэктар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача Вера Палякова-Макей – старшыня журы; дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі Наталля Вашчыла; старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Леанід Крыванос; загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі; аўтар і выканаўца ўласных песень, рэжысёр, мастацкі кіраўнік народнага літаратурнага тэатра “Жывое слова” Алеся Сівохіна; кіраўнік Прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Юрый Макушын.

У апошні час анлайн-конкурсы чытальнікаў становяцца вельмі папулярнай і найбольш запатрабаванай формай, якую мэтазгодна выкарыстоўваць сярод дзяцей. Яе актуальнасць пачала назірацца падчас эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне, а таксама



Сярод усіх удзельнікаў былі выбраны каля 200 лепшых чытальнікаў, якія прайшлі на наступны, фінальны этап конкурсу.




камп'ютарызацыі, пры якой дзеці актыўна карыстаюцца гаджэтамі. Таму такое аддаленае чытанне не на публіку становіцца больш прымальным для іх. Разам з тым, добрае чытанне на камеру яшчэ не з'яўляецца паказчыкам таго, што чалавек добра чытае "ўжывую". Усё ж было прынята рашэнне выбраць форму анлайн для правядзення літаратурнага конкурсу. Не гледзячы на тое, што ён праходзіў у рамках абласнога праекта "Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю", адразу планавалася зрабіць яго міжнародным і далучыць дзяцей з іншых рэгіёнаў і замежжа. Таму перад пачаткам ініцыятывы праводзілася рэкламная кампанія, рассылаліся лісты з запрашэннямі па ўсёй Беларусі і бліжэйшым замежжы.

На адрас конкурсу адразу, з першых дзён яго пачатку паступала вельмі шмат творчых прац. Усяго налічвалася каля 1800 удзельнікаў з Беларусі і бліжэйшага замежжа, таму конкурс і набыў статус міжнароднага. Для выразнага чытання выбіраліся самыя розныя творы Максіма Багдановіча. Самымі папулярнымі сярод дзяцей сталі вершы: "Зорка Венера", "Здароў, марозны, звонкі вечар…", "Слуцкія ткачыхі", байка "Варона і чыж", " Край мой родны, як выкляты богам", "Я хацеў бы спаткацца з вамі на вуліцы…", "Па-над белым пухам вішняў", "Летапісец" і іншыя. Сябры журы звярталі ўвагу на літаратурнае чытанне, успрыманне твора ўдзельнікам, на правільную расстаноўку акцэнтаў твора. Былі працы ад удзельнікаў, якія прафесійна займаюцца мастацкім чытаннем.

Усе творчыя працы запампоўваліся на афіцыйную старонку Ютуб-канала Мінскай абласной бібліятэкі, дзе можна было лёгка знайсці відэазапіс, прагаласаваць за любое творчае выступленне. Сярод іх як вельмі прафесійна створаныя відэа з выразнай падачай і артыстычнасцю, старанна падабранымі касцюмамі і дэкарацыямі, вынаходлівым мантажом і выкарыстаннем "храмакея", так і дамашнія відэа, зробленыя самімі дзецьмі і іх бацькамі.

У сувязі з вялікай колькасцю творчых прац было прынята рашэнне правесці два туры адбору сярод удзельнікаў. Першы тур конкурсу праходзіў 20 студзеня – 19 лютага 2023 года, падчас якога экспертнае журы праглядзела ўсе працы.

Трэба адзначыць гэтую складаную працу вызначэння з такой колькасці выдатных прац найлепшых.

Мы атрымлівалі добрыя водгукі пра конкурс і неабходнасць такіх ініцыятыў. Хочацца прывесці адзін з такіх водгукаў: "Паважаныя арганізатары конкурсу «Пад Зоркай Венеры», шаноўнае журы! Дзякуй вам за тытанічную працу! Прагледзець амаль 2000 ролікаў – гэта трэба столькі часу і цярпення! А галоўнае – любові да сваёй роднай культуры! Бо нічым іншым не растлумачыць і такі наплыў удзельнікаў, і такую самааддачу арганізатараў. Я ўпэўнена, што падобныя конкурсы нам вельмі патрэбныя.<…> Беларуская культура гаворыць вуснамі дзяцей. Багдановіч гучыць сучасна, і кожны прадстаўляе сваё асабістае прачытанне яго твора. І ў кожнага застанецца памяць аб удзеле ў гэтым конкурсе і цяпло ўнутры. І ўжо ніхто не забудзе аўтара, які напісаў «Здароў, марозны, звонкі вечар…»" (Юлія Аленькава, г. Магілёў).

Пасяджэнне сяброў журы і аргкамітэта адбылося 27 лютага 2023 года, на якім з фіналістаў былі адзначаны 40 пераможцаў: ва ўмовах такой высокай канкурэнцыі іх працы вылучаліся большай арыгінальнасцю задумкі і выканання, дзякуючы чаму заслужана занялі свае прызавыя месцы. 28 лютага 2023 года на сайце бібліятэкі і ў сацсетках былі агучаны пераможцы конкурсу, сярод якіх былі вылучаны 17 дзяцей з Мінскай вобласці і 2 з г. Мінска.

Акрамя гэтага партнёры анлайн-конкурсу "Пад зоркай Венеры" адзначылі асобныя працы ўдзельнікаў дадатковымі намінацыямі, гэтыя дзеці таксама былі запрошаны на выніковае мерапрыемства анлайн-конкурсу для ўручэння ўзнагарод.

31 сакавіка 2023 года Мінская абласная бібліятэка сустрэла пераможцаў анлайн-конкурсу чытальнікаў "Пад зоркай Венеры", якія прыехалі на мерапрыемства ў суправаджэнні бацькоў, настаўнікаў і бібліятэкараў школ з розных куткоў Беларусі. Замежныя пераможцы Анастасія Еніна, Эвеліна Капітонава і Дар'я Канавалава разам з загадчыцай




філіяла "Цэнтр беларускай культуры «Музей М. Багдановіча»" ў Яраслаўлі Наталляй Прохаравай далучыліся да мерапрыемства праз анлайн-эфір і пажадалі далейшых поспехаў пераможцам конкурсу.

Падчас цэрымоніі пераможцы атрымалі ганаровыя дыпломы і "зорку пераможцы", а таксама білеты на самыя папулярныя спектаклі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача. Былі ўручаны прызы спецыяльным лаўрэатам ад партнёраў і членаў журы конкурсу, сярод якіх кіраўнік прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Юрый Макушын, кіраўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі, намеснік старшыні Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Рагнед Малахоўскі, рэжысёры і кіраўнікі народнага літаратурнага тэатра "Жывое слова" Алесь Мойскі і Алеся Сівохіна, журналіст газеты "Літаратура і мастацтва" Яна Будовіч.

Яркімі акцэнтамі святочнага мерапрыемства сталі выступленні прафесійных музыкаў і акцёраў: заслужанага калектыва Рэспублікі Беларусь "Музычная капэла «Санорус»" пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Вячаслава Ларына; салістаў, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў Уладзіслава Даніловіча і Ганны Янкоўскай Беларускай дзяржаўнай філармоніі, якія выконвалі рамансы на вершы Максіма Багдановіча. Сваім арыгінальным чытаннем творчасці беларускага паэта падзяліліся ўдзельнікі народнага літаратурнага тэатра "Жывое слова" пад кіраўніцтвам Алеся Мойскага і Алесі Сівохінай. Зразумела, што святочная праграма не магла абысціся без выступленняў саміх лаўрэатаў конкурсу – вершы Максіма Багдановіча прачыталі ўдзельніца ўзорнага дзіцячага тэатра "Вясёлка" Палаца культуры г. Барань Аршанскага раёна Віцебскай вобласці Арына Рубановіч і навучэнец сярэдняй школы № 3 г. Оршы імя У. Караткевіча Максім Голубеў.

Аргкамітэт і члены журы віншуюць пераможцаў анлайн-конкурсу чытальнікаў "Пад зоркай Венеры"! Арганізатары выказваюць удзячнасць усім, хто адгукнуўся і прыняў удзел у конкурсе – усе вашыя намаганні былі заўважаныя! Не спыняйцеся, працягвайце развіваць і ўдасканальваць свае таленты і навыкі! Жадаем усім удзельнікам дасягнення новых вышынь!



Н. КЛОЧКОВА
библиотека ГУО «Средняя школа № 21 г. Могилева»

# «ЗА чтение»

## Сетевой проект к Международному дню семьи

ГУО «Средняя школа № 21 г. Могилева» осуществила первый свой сетевой проект. Конечно, это стало возможным после прохождения определенных этапов развития библиотеки: развитие блога «Книжная идентификация» — https://schoolbibl21mogilev.blogspot.com/; самообразование заведующего библиотекой Клочковой Натальи Григорьевны.